# Прамова кіраўніка дэлегацыі Беларускай ССР К. Кісялёва на пленарным паседжанні 24 верасня

НЬЮ-ЙОРК, 25 верасня. (ТАСС). Выступаючы ў агульнай дыскусіі на пленарным паседжанні Генеральнай Асамблеі 24 верасня, кіраўнік дэлегацыі Беларускай ССР тав. Кісялёў заявіў:

Прайшло ўжо больш чатырох год з таго часу, як была створана Арганізацыя Аб'яднаных Нацый. Натуральна, паўстае пытанне, што-ж зроблена Арганізацыяй за гэты перыяд, з якімі вынікамі мы прышлі на чацвёртую сесію Генеральнай Асамблеі.

Я ўважліва пачытаў даклад генеральнага сакратара ААН пана Тругве Лі. Дакладчык ва ўступнай частцы свайго даклада заяўляе, што «справаздачны перыяд быў увогуле годам прагрэсу ў напрамку да больш спакойнага міру і што ААН дабілася міжнароднага супрацоўніцтва амаль ва ўсіх галінах чалавечай дзейнасці ў небывалых раней маштабах».

Ці правільная такая ацэнка міжнароднага становішча, якое склалася на сённяшні дзень?

Не, няправільная. Мякка гаворачы, гэта крызісам, прага ваенных прыбыткаў— вось што штурхае кіруючыя кругі Уол-стрыта да ўсё большага і большага павелічэння ваенных выдаткаў, да палітыкі развязвання новай вайны. Кіруючыя кругі амерыканскіх манаполій адкрыта падтрымліваюць стан трывогі і няўпэўненасці ў міжнародных адносінах і ўсё павялічваючуюся гонку ўзбраенняў.

Паводле даных бюлетэня нью-йоркскага банка, прыбыткі 525 вядучых карпарацый за 1948 год дасягнулі небывалага ўзроўню—18,8—23 працэнтаў да ўкладзенага капітала, што складае 35,6 мільярда долараў супраць 9,3 мільярда ў 1940 годзе і 22,4 мільярда долараў у 1945 годзе. Таму пядзіўна, што для манаполістаў вайна з'яўляецца найбольш прыбытковым артыкулам. яны стараюцца так ці інакш справакаваць новую вайну, яны палохаюцца, што нечакана можа «разразіцца мір».

Гістарычныя ўрокі іх нічому не навучылі. Сакрушальны разгром і крах гітлераўскай Германіі, якая ўвасабляла ў сабе таннямі. Такое важнае пытанне, як пытанне аб занятасці і беспрацоўі, пастаўленае на апошняй сесіі Эканамічнага і Сацыяльнага совета па ініцыятыве Сусветнай федэрацыі профсаюзаў, не знайшло належнага вырашэння ў совеце. Замест прыняцця банкрэтных рэкамендацый, накіраваных на барацьбу з беспрацоўем і паляпшэнне жахлівага становішча шматмільённай арміі беспрацоўных, англа-амерыканская большасць совета перадала гэтае пытанне для далейшага вывучэння Міжнароднай арганізацыі працы, якая, як вядома, зарэкамендавала сябе за трыццаціг(од)овы перыяд свайго існавання як верны абаронца інтарэсаў прадпрыемцаў. Такі-ж лёс у совеце напаткала і пытанне аб правах профсаюзаў. Нельга таксама не звярнуць увагі і на той факт, што пытанне аб роўнай аплаце за роўную працу мужчын і жанчын вось ужо на працягу некалькіх сесій Эканамічнага і Сацыяльнага совета не можа атрымаць належнага вырашэння.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы